Весці БДПУ. Серыя 1. 2026. № 2. С. 11–15

УДК 37:04

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПЕРАЕМНАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ НА РОЗНЫХ УЗРОЎНЯХ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ

**В. Л. Лазіцкі,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ПалесДУ*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0003-2704-7872*

UDC 37:04

# ENSURING CONTINUITY IN THE FORMATION OF HISTORICAL MEMORY AT VARIOUS LEVELS OF THE EDUCATION SYSTEM

**V. Lazitsky,**
*PhD in Pedagogics, Associate Professor, Associate Professor of Department of Social and Humanitarian Disciplines, PolesSU*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0003-2704-7872*

Паступіў у рэдакцыю 16.02.2026.

Received on 16.02.2026.

У артыкуле разглядаецца праблематыка фарміравання феномена гістарычнай памяці ў кантэксце канцэптуальных палажэнняў сучаснай гістарычнай і педагагічнай навукі. Распрацаваны беларускімі навукоўцамі – гісторыкамі і педагогамі канцэпт гістарычнай памяці з’яўляецца базавым у даследаваннях у галіне методыкі выкладання гісторыі з улікам праблемных пытанняў выкарыстання на практыцы ідэй пераемнасці. Аўтарам абгрунтоўваюцца палажэнні рэсурснага забеспячэння фарміравання гістарычнай памяці навучэнцаў у якасці інтэграванай характарыстыкі асобы. Разглядаюцца дыферэнцаваныя прыкметы феномена пераемнасці, улік якіх дазваляе вызначаць метадалагічныя аспекты не толькі фарміравання, але і развіцця гістарычнай памяці на ўзроўнях агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. У межах методыкі выкладання вучэбных прадметаў «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» і «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» аўтарам вызначаны арганізацыйна-педагагічныя ўмовы дасягнення эфектыўнасці ў метадычным забеспячэнні сфарміраванасці гістарычнай памяці асобы навучэнца ў кантэксце пераемнасці. Атрыманыя навуковыя абагульненні з’яўляюцца важнымі для стварэння эфектыўных мадэлей працэсуальнага фарміравання гістарычнай памяці як дыдактычнага канструявання асабасна запатрабаваных і эмацыйна афарбаваных для суб’ектаў адукацыйнай дзейнасці ведаў.

*Ключавыя словы*: гістарычная памяць, гістарычная адукацыя, канцэпт гістарычнай памяці, інтэгратыўная якасць асобы, пераемнасць, методыка навучання гісторыі.

The article discusses the formation of the phenomenon of historical memory in the context of the conceptual provisions of modern historical and pedagogical science. The concept of historical memory, developed by Belarusian historians and teachers, is fundamental in research in the field of methods of teaching history, taking into account the problems of applying the ideas of continuity in practice. The author justifies the provisions of resource support for the formation of the historical memory of students as an integral characteristic of a person. Differentiating characteristics of the phenomenon of continuity are considered, the consideration of which makes it possible to determine the methodological aspects of not only the formation, but also the development of historical memory at the levels of general secondary, secondary specialized and higher education. Within the framework of the methodology for teaching subjects "History of Belarusian statehood" and "The Great Patriotic War of the Soviet people (in the context of World War II)", the author determined the organizational and pedagogical conditions for achieving the effectiveness of methodological support for the formation of the historical memory of the student’s personality in the context of continuity. The obtained scientific generalizations are important for creating effective models of the procedural formation of historical memory as a didactic construction of personally demanded and emotionally colored knowledge for subjects of educational activity.

*Keywords:* historical memory, historical education, the concept of historical memory, integrative quality of personality, continuity, methodology for teaching history.

*Уводзіны.* Увага даследчыкаў да праблематыкі фарміравання гістарычнай памяці асобы аб’ектыўна абумоўлена як тэндэнцыямі развіцця сацыяльна-гуманітарных навуковых ведаў, так і важнымі мадэрнізацыйнымі працэсамі ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь. Шырокая інтэграцыя ў дыскурс навуковага пошуку анталагічнага аспекту даследавання паняцця «гістарычная памяць» разам з вывучэннем працэсуальных складнікаў у фарміраванні феномена знайшлі адлюстраванне ў публікацыях гісторыкаў, філосафаў, сацыёлагаў і педагогаў [1–7]. Важным вынікам намаганняў беларускай акадэмічнай навукі стала распрацаванасць канцэпту гістарычнай памяці. Прызнанне яе дзяржаваўтваральнай значнасці атрымала заканадаўчае адлюстраванне ў артыкулах 15 і 54 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь [8]. Асноўны закон нашай краіны ўсталёўвае непасрэдную адказнасць як дзяржавы, так і саміх грамадзян у пытаннях захавання гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, гістарычнай памяці. У Беларусі

атрымалі належнае развіццё розныя формы правядзення мерапрыемстваў каммемаратыўнага характару, накіраваных на свядомую, мэтанакіраваную актуалізацыю канкрэтных гістарычных падзей. Замацаваная ў дзяржаўнай палітыцы каммемарацыя адлюстроўвае захаванне ў грамадскай свядомасці памяці аб значных падзеях мінулага праз рэканструкцыю ўзаемадзеяння мінулага і сучаснасці.

Практычнае замацаванне ў вучэбных планах новага пакалення на ўзроўнях агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі атрымалі дысцыпліны: «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», «Гісторыя Беларусі ў кантэксце ўсеагульнай гісторыі», «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Існуючы ўзровень нарматыўнай прававой, тэарэтыка-метадалагічнай і практычнай распрацаванасці пытанняў фарміравання гістарычнай памяці ў даследаваннях расійскіх і беларускіх гісторыкаў і педагогаў (публікацыі Я. Я. Вяземскага і В. Ю. Стрэлавай, Г. Э. Давідоўскай, А. А. Кавалені, К. М. Крышталя, С. В. Панова [1; 4; 5; 7; 9; 10]) дазваляе вызначыць вельмі важны кірунак навуковага пошуку, які тычыцца аспектаў развіцця методыкі гістарычнай адукацыі. У кантэксце распрацоўкі сістэмы эфектыўных метадаў, прыёмаў і сродкаў забеспячэння сфарміраванасці гістарычнай памяці як інтэгратыўнай якасці асобы навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі мэтазгодным з'яўляецца вырашэнне наступных задач:

– навуковае абгрунтаванне анталагічнага разумення паняційна-тэрміналагічнага апарату, які выкарыстоўваецца ў даследаванні феномена гістарычнай памяці асобы і механізма дасягнення яе працэсуальнага фарміравання ў кантэксце рэалізацыі пераемнасці (з улікам трансфармацыі асэнсавання гістарычнай памяці з яе інстытуцыянальнага аспекту ў асабіста-запатрабаваную якасць асобы навучэнца);

– абгрунтаванае вылучэнне рэсурснага (нарматыўнага прававога, арганізацыйна-педагагічнага, вучэбна-метадычнага і інструментальнага) забеспячэння фарміравання гістарычнай памяці навучэнцаў з улікам яе шматкампанентнай структуры і змястоўнага напаўнення, а таксама механізмаў пераемнасці ў адукацыі;

– практыкаарыентаванае вызначэнне арганізацыйна-педагагічных умоў рэалізацыі методыкі фарміравання гістарычнай памяці навучэнцаў з улікам пераемнасці ўзроўняў адукацыі і спецыфікі шматкампанентнасці вучэбных гістарычных ведаў.

Аналіз навуковых даследаванняў па пытаннях фарміравання гістарычнай памяці асобы навучэнца дазваляе зрабіць выснову пра недастатковы ўзровень вывучанасці аспекта пераемнасці ў працэсуальным станаўленні і развіцці даследуемай інтэграванай якасці на ўзроўнях адукацыі. У комплексе вызначаных задач ліквідацыя гэтага недахопу з'яўляецца істотнай тэарэтыка-метадалагічнай і практыкаарыентаванай праблемай.

Вырашэнне азначаных праблемных пытанняў у іх комплекснасці запатрабавала выкарыстання метадаў параўнальнага аналізу, сінтэзу, абагульнення і сістэматызацыі. Крыніцамі даследчыцкага пошуку сталі: дакументы дзяржаўных праграм развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь [11–14]; навуковыя і навукова-метадычныя публікацыі па актуальных пытаннях тэарэтыка-метадалагічнага і практыкаарыентаванага характару [1–7; 9; 10]; артыкулы аўтара, прысвечаныя аналізу этапных вынікаў кіраўніцтва даследаваннем тэм кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін УА «Палескі дзяржаўны ўніверсітэт» [15–17].

*Асноўная частка.* Логіка метадалогіі навуковага даследавання арыентуе ўвагу на анталагічны аспект у трактоўцы паняцця «гістарычная памяць» у кантэксце сацыяльна-педагагічнай праблематыкі праз асэнсаванне дадзенага феномена як інтэгратыўнай шматкампанентнай якасці асобы. Аналіз навуковых публікацый дазваляе зрабіць выснову аб разнастайнасці пунктаў гледжання даследчыкаў – гісторыкаў і педагогаў, якія тлумачаць вызначаны намі прадмет даследавання як:

– фактар пераемнасці і бесперапыннасці сацыяльнага быцця, захавання таго гістарычнага мінулага, якое мае значнасць для грамадства ў дадзены момант, інструмент для кансалідацыі грамадства;

– памяць асобы як культурна-гістарычнага суб'екта, які ўспрымае гісторыю як сваё мінулае;

– педагагічна адаптаваны сацыяльны вопыт папярэдніх пакаленняў у складзе тэарэтычных, факталагічных, ацэначных ведаў, спосабаў дзейнасці, досведу творчай дзейнасці і эмацыйна-каштоўнасных адносін;

– складнік у фарміраванні кампетэнцыі грамадзянскасці ў комплексе ўніверсальных кампетэнцый асобы [10, с. 150].

Зыходзячы з такога разумення працэсуальны бок фарміравання гістарычнай памяці асобы навучэнца неабходна разглядаць (у гэтым нельга не пагадзіцца з беларускім вучоным С. В. Пановым [7, с. 119]) як арганізаванае ў педагагічным узаемадзеянні дыдактычнае канструяванне асобасна запатрабаваных і эмацыйна афарбаваных для суб'екта адукацыйнай дзейнасці ведаў і дзеянняў. Сфарміраванасць гістарычнай памяці навучэнца (гэта паступова дасягнуты ім вынік) – развітая і трывала замацаваная ў кагнітыўным, эмацыйна-каштоўнасным, вобразным, дзейнасным кампанентах інтэграваная якасць асобы, якая праяўляецца ў беражлівым і паважлівым стаўленні да гістарычнага мінулага як асновы сацыякультурнай ідэнтыфікацыі. Дадзеныя вызначэнні ўлічаны намі ў сфармуляваных характарыстыках гістарычнай памяці, якія адлюстроўваюць яе функцыянальнасць з пазіцый рэалізацыі сістэмы методыкі гістарычнай адукацыі:

– працэсуальнасць станаўлення, захавання і развіцця выключна ў межах сацыяльнай арганізацыі і светапогляднай структуры асобы з улікам яе псіхалагічных асаблівасцей;

– шматсуб'ектнасць грамадства і сацыяльных груп, інстытуцыйных арганізацый і асоб

(навучэнцаў і педагогаў) у якасці суб'ектаў педагагічнага ўзаемадзеяння ў межах гістарычнай адукацыі і выхавання;

– сістэмнасць і структураванасць шматкампанентнага складу (кагнітыўны, вобразны, эмацыйна-каштоўнасны і дзейнасны), якія рэалізуюцца ў пераемнасці ўзроўняў адукацыі (у тым ліку і школьнай гістарычнай адукацыі);

– шматмернасць праяў разнастайнасці каштоўнасных сістэм, сацыяльных норм суб'ектаў педагагічных узаемадзеянняў як носьбітаў гістарычнай памяці, яе крыніц і транслятараў;

– кіруемасць працэсам фарміравання гістарычнай памяці, яго рэсурсным забеспячэннем;

– уплывовасць працэсуальнай накіраванасці фарміравання на этапнае развіццё навучэнцаў і іх актыўны ўдзел у сацыяльнай практыцы, які замацоўвае інтэграваныя якасці асобы навучэнца ў сацыяльным вопыце;

– прагназуемасць выніковасці фарміравання і развіцця праз вызначэнне перспектыў і якаснай накіраванасці працэса.

Прыведзеныя характарыстыкі суадносяцца ў неабходнай з метадалагічнага боку параўнальнай карэляцыі з анталагічнымі рысамі пераемнасці ў пэўнай трыядзе як: а) аднаго з прынцыпаў дыдактыкі; б) умовы фарміравання і развіцця гістарычнай памяці навучэнцаў на ўзроўнях адукацыі; в) дасягнутага выніку этапнага фарміравання інтэграванай якасці асобы. Пераемнасць вызначаецца намі з пазіцый разумення дыялектыкі, яе фенаменалагічных праяў і функцыянальнай рэалізацыі сістэмаўтваральных характарыстык.

Аналіз палажэнняў канцэпту пераемнасці (праведзены намі раней [17]) дазваляе разглядаць забеспячэнне працэсу фарміравання гістарычнай памяці з улікам зместавага напаўнення яе кампанентаў:

– кагнітыўны (арыентуе пераемнасць развіцця ў паглыбленні паўнаты і трываласці засваення складнікаў гістарычных ведаў: уяўленні і веды навучэнцаў аб гістарычным працэсе, аб заканамерных і спецыфічных з'явах грамадска-гістарычнага развіцця; веданне гістарычнай храналогіі і фактаў, што прадугледжвае ў тым ліку і ўзаемазвязаныя з дзейнасным кампанентам уменні характарызаваць месцы памяці ў гістарычным часе і прасторы; веданне гістарычных традыцый свайго народа і дасягненняў у галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры; веданне гісторыі сваёй сям'і і сямейных традыцый);

– вобразны (працэсуальна фарміруецца праз дзейнасць механізмаў фарміравання ў навучэнцаў вобразаў гістарычнага мінулага і выкананне алгарытма прадстаўлення і засваення зместу вучэбнага матэрыялу «слова – вобраз – дзеянне» і «вобраз – слова – дзеянне»). У анталагічным кантэксце ў вобразе ўвасабляецца ўласнае асобаснае ўяўленне пра каго-небудзь ці пра што-небудзь. Гістарычны вобраз характарызуе пачуццёва-эмацыйнае ўяўленне аб асобах – суб'ектах і аб'ектах гістарычнага працэсу, гістарычным асяроддзі, гістарычных фактах у іх ацэначным разуменні (на сутнаснае разуменне гістарычных уяўленняў указвае беларуская даследчыца Г. Э. Давідоўская [9]);

– эмацыйна-каштоўнасны (звязаны з фарміраваннем такіх асобасных якасцей навучэнцаў, як здольнасці да эмпатыі і фармулявання ўласнага стаўлення да гістарычных асоб і іх дзейнасці);

– дзейнасны (з пазіцый кампетэнтнаснага падыходу дазваляе ўлічваць нарматыўна абумоўленыя патрабаванні вучэбных праграм і замацаваныя ва ўласным сацыяльным вопыце засвоеныя спосабы дзейнасці, неабходныя для авалодання гістарычнымі ведамі, у тым ліку і з выкарыстаннем метадычных прыёмаў фарміравання і творчай рэканструкцыі вобразаў гістарычнага мінулага).

Заўважым неабходнасць уліку сфарміраванасці ў навучэнцаў універсальных кампетэнцый згодна палажэнняў канцэпту, распрацаванага беларускімі вучонымі-педагогамі ў рамках выканання Дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Универсальные компетенции» [18]. Методыка фарміравання і развіцця вызначаных кампанентаў у вучняў агульнаадукацыйных устаноў, студэнтаў устаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі павінна ўлічваць узроставую спецыфіку навучання і выхавання, дакладнае разуменне асаблівасцей псіхолага-педагагічных працэсаў, неабходную распрацаванасць рэсурснага забеспячэння на ўзроўнях: нарматыўным прававым, арганізацыйна-педагагічным, вучэбна-метадычным і інструментальным. Рашэнне задачы рэсурснага забеспячэння ў распрацоўцы методыкі прадугледжваюць улік дыдактычнага і выхаваўчага патэнцыялу традыцыйных вучэбных дапаможнікаў разам з высокатэхналагічнымі сродкамі навучання (напрыклад, ЭВМК – электронных вучэбна-метадычных комплексаў па прадметах «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», «Гісторыя Беларусі ў кантэксце ўсеагульнай гісторыі», «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» [15; 16]). Метадычны падмурак падмацоўвае рэалізацыя комплексу мерапрыемстваў каммемаратыўнай практыкі. У іх пераліку магчыма вызначыць: ваенныя парады; ушанаванне выдатных дзяржаўных асоб і цырымоніі ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі; святкаванні памятных дат і юбілеяў; стварэнне помнікаў і мемарыяльных комплексаў, мемарыяльных знакаў і пліт; рытуалы ўскладання вянкоў і кветак да месцаў пахавання герояў вайны і ахвяр палітыкі генацыда на беларускай зямлі; стварэнне музейных экспазіцый і іх наведванне.

У якасці прыёмаў фарміравання і творчай рэканструкцыі вобразаў гістарычнага мінулага, якія ў сваёй сукупнасці дазваляюць рэалізаваць дыдактычныя магчымасці фарміравання гістарычнай памяці, мэтазгодна адзначыць карціннае і аналітычнае апісанне, вобразныя характарыстыкі, драматызацыя і стылізацыя. У сваю чаргу само фарміраванне эмацыянальна-пачуццёвага вопыту ў працэсе навучання гісторыіі з'яўляецца вынікам перажывання і асэнсавання асабіста

значных з'яў і падзей у асабістым сацыяльным вопыце навучэнцаў. Нельга не пагадзіцца з С. В. Пановым у тым, што «складнікамі эмацыянальна-пачуццёвага вопыту з'яўляюцца тэарытычныя, фактычныя, ацэначныя вучэбныя гістарычныя веды, а таксама прадметныя спосабы дзейнасці, вопыт творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін да гістарычнага мінулага і яго ўдзельнікаў з улікам спецыфікі вучэбных гістарычных ведаў, якія рэканструіруюцца ва ўмовах ажыццяўлення дзяржаўнай гістарычнай палітыкі і дыдактычна канструіруюцца згодна з патрабаваннямі псіхолага-педагагічнай тэорыі» [7, с. 120].

Важным дэтэрмінантам фарміравання гістарычнай памяці вучняў і студэнтаў устаноў адукацыі з'яўляецца трансфармацыя канцэпту гістарычнай памяці як сацыяльна-педагагічнай катэгорыі ў асабістую якасць асобы. Важнай праявай трансфармацыі бачыцца актыўная сацыялізацыя навучнцаў праз актуалізацыю як інтэлектуальнай, так і эмацыйна-каштоўнаснай сфер развіцця асобы, удзел у грамадскім жыцці і мерапрыемствах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

*Заключэнне.* У якасці высноў адзначым наступнае. Практычнае вырашэнне пытанняў забеспячэння пераемнасці ў кантэксце праблематыкі фарміравання гістарычнай памяці як інтэграванай якасці асобы навучэнцаў на ўзроўнях агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі актуалізавана мэтамі развіцця сістэмы бесперапыннай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Распрацоўка дадзенай праблемы з'яўляецца тэарэтыка-метадалагічным і практыкаарыентаваным кірункам навуковага пошуку з пазіцый асэнсавання комплексу пытанняў сацыяльна-педагагічнай і міждысцыплінарнай значнасці. У якасці імператыўных умоў-дэтэрмінантаў выніковай працэсуальнай эфектыўнасці ў фарміраванні (як і ў развіцці, захаванні) гістарычнай памяці навучэнцаў неабходна вызначыць:

– распрацаванасць сістэмна ўяўляемай методыкі з улікам спецыфікі ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці і выхавання на ўзроўнях адукацыі ва ўмовах удасканалення гістарычнай адукацыі;

– стварэнне і эмпірычнае абгрунтаванне дыдактычных мадэлей фарміравання шматкампанентнага складу гістарычнай памяці асобы з улікам адаптаванага інструментарыя педагагічнай дыягностыкі выніковасці працэсу;

– забеспячэнне пераемнасці ў засваенні ўніверсальных кампетэнцый навучэнцамі ў якасці дасягнення ўзроўневай падрыхтаванасці да прадуктыўнай адукацыйнай дзейнасці ў сучасным грамадстве;

– абагульненне, сістэматызацыя і далейшае распаўсюджанне перадавога вопыту эфектыўнай педагагічнай працы па фарміраванню гістарычнай памяці вучняў і студэнтаў устаноў агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Атрыманыя ў працэсе навуковай рэфлексіі абагульненні ў сваім тэарэтыка-метадалагічным і практыкаарыентаваным значэнні з'яўляюцца падставай працягу распрацоўкі метадычнай сістэмы фарміравання гістарычнай памяці як перспектыўнага напрамку даследавання.

*Літаратура*


1. *Вяземский, Е. Е.* Воспитание культуры исторической памяти и Календарь образовательных событий в социокультурном пространстве развивающегося общества / Е. Е. Вяземский, О. Ю. Стрелова // Инновационные проекты и программы в образовании. – 2021. – № 2. – С. 66–71.
2. *Денисова, Н. Ф.* Историческая память белорусов: социологический анализ / Н. Ф. Денисова, Н. М. Бровчук // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2018. – Т. 63. – № 1. – С. 21–32.
3. *Капитонова, Т. А.* Исследования исторической памяти в современном социогуманитарном знании: трансдисциплинарная перспектива / Т. А. Капитонова, В. А. Белокрылова // Философские исследования. – 2016. – № 3. – С. 69–76.
4. *Коваленя, А. А.* Историческая политика в национально-государственном строительстве современной Беларуси / А. А. Коваленя, В. Ю. Арчаков, В. В. Данилович, А. Л. Баньковский // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2019. – № 4. – С. 3–12.
5. *Каваленя, А. А.* Год гістарычнай памяці – сродак разумення вытокаў і развіцця беларускага народа / А. А. Каваленя // Известия Национальной академии наук Беларуси. Серия гуманитарных наук. – 2022. – Т. 67, № 4. – С. 373–385.
6. *Мысливец, Н. Л.* Историческая память: актуальность исследования и необходимость сохранения / Н. Л. Мысливец // Беларус. думка. – 2022. – № 2. – С. 56–62.
7. *Паноў, С. В.* Канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь / С. В. Паноў. – Мн. : НІА, 2023. – 272 с.


*References*


1. *Vyazemskij, E. E.* Vospitanie kul'tury istoricheskoj pamyati i Kalendar' obrazovatel'nyh sobytij v sociokul'turnom prostranstve razvivayushchegosya obshchestva / E. E. Vyazemskij, O. Yu. Strelova // Innovacionnye proekty i programmy v obrazovanii. – 2021. – № 2. – S. 66–71.
2. *Denisova, N. F.* Istoricheskaya pamyat' belorusov: sociologicheskij analiz / N. F. Denisova, N. M. Brovchuk // Vesci Nacyyanal'naj akademii navuk Belarusi. Seryya gumanitarnyh navuk. – 2018. – T. 63. – № 1. – S. 21–32.
3. *Kapitonova, T. A.* Issledovaniya istoricheskoj pamyati v sovremennom sociogumanitarnom znanii: transdisciplinarnaya perspektiva / T. A. Kapitonova, V. A. Belokrylova // Filosofskie issledovaniya. – 2016. – № 3. – S. 69–76.
4. *Kovalenya, A. A.* Istoricheskaya politika v nacional'no-gosudarstvennom stroitel'stve sovremennoj Belarusi / A. A. Kovalenya, V. Yu. Archakov, V. V. Danilovich, A. L. Ban'kovskij // Gistoryya i gramadaznaŭstva. – 2019. – № 4. – S. 3–12.
5. *Kavalenya, A. A.* God gistarychnaj pamyaci – srodak razumennya vytokaŭ i razviccya belaruskaga naroda / A. A. Kavalenya // Izvestiya Nacional'noj akademii nauk Belarusi. Seriya gumanitarnyh nauk. – 2022. – T. 67, № 4. – S. 373–385.
6. *Myslivec, N. L.* Istoricheskaya pamyat': aktual'nost' issledovaniya i neobhodimost' sohraneniya / N. L. Myslivec // Belarus. dumka. – 2022. – № 2. – S. 56–62.
7. *Panoŭ, S. V.* Kanceptual'nyya asnovy razviccya shkol'naj gistarychnaj adukacyi ŭ Respublicy Belarus' / S. V. Panoŭ. – Mn. : NIA, 2023. – 272 s.

8. Конституция Республики Беларусь : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022 г. // ЭТАЛОН : информ.-поисковая система. – URL: https://etalonline.by/document/?regnum=V19402875 (дата обращения : 06.02.2026).
9. *Давідоўская, Г. Э.* Фарміраванне вобразных уяўленняў у вучняў 8–9 класаў пры вывучэнні гісторыі Беларусі : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. Э. Давідоўская ; пад рэд. С. В. Панова. – Мн. : НІА, 2022. – 176 с.
10. *Кришталь, К. Н.* Историческая память как социокультурный и педагогический феномен / К. Н. Кришталь // Зборнік навуковых прац Акадэміі адукацыі. – 2025. – Вып. 22. – С. 146–159.
11. О Концепции развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 30 нояб. 2021 г., № 683 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100683 (дата обращения: 06.02.2026).
12. Концепция школьного исторического образования в Республике Беларусь. Одобрена постановлением Министерства образования Республики Беларусь 08.11.2022 № 13.2 // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2024. – № 2. – С. 6–14.
13. Концепция оптимизации содержания, структуры и объема цикла (модуля) социально-гуманитарных дисциплин в учреждениях высшего образования / Министерство образования Республики Беларусь. – URL: https://www.bsuir.by/m/12_100229_1_162873.pdf (дата обращения: 06.02.2026).
14. Стратегия развития системы образования Республики Беларусь до 2035 года : Решение коллегии Министерства образования Республики Беларусь от 12 декабря 2024 г. № 19.33 / Эталон : информационно-правовой интернет-портал. – URL: https://etalonline.by/document/?regnum=u02403003 (дата обращения: 06.02.2026).
15. *Лозицкий, В. Л.* Опыт разработки электронных образовательных ресурсов на базе платформы Moodle для школьного исторического и обществоведческого образования / В. Л. Лозицкий // Веснік адукацыі. – 2017. – № 5. – С. 10–15.
16. *Лазіцкі, В. Л.* Электронны вучэбна-метадычны комплекс «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» як дыдактычны сродак навучання / В. Л. Лазіцкі // Беларус. гіст. часоп. – 2023. – № 1. – С. 6–9.
17. *Лозицкий, В. Л.* Концепт преемственности уровней общего среднего и высшего образования в условиях цифровой трансформации / В. Л. Лозицкий // Адукацыя і выхаванне. – 2024. – № 11. – С. 38–43.
18. Формирование универсальных компетенций обучающихся в контексте ведущих тенденций развития образования / О. В. Зеленко, В. Ф. Русецкий, В. Г. Стуканов [и др.] // Веснік адукацыі. – 2025. – № 2 (266). – С. 6–11.

8. Konstituciya Respubliki Belarus' : s izm. i dop., prinyatymi na resp. referendumah 24 noyab. 1996 g., 17 okt. 2004 g. i 27 fevr. 2022 g. // ETALON : inform.-poiskovaya sistema. – URL: https://etalonline.by/document/?regnum=V19402875 (data obrashcheniya : 06.02.2026).
9. *Davidoŭskaya, G. E.* Farmiravanne vobraznyh uyaŭlennyaŭ u vuchnyaŭ 8–9 klasaŭ pry vyvuchenni gistoryi Belarusi : dapam. dlya nastaŭnikaŭ ustanoŭ agul. syared. adukacyi z belarus. i rus. movami navuchannya / G. E. Davidoŭskaya ; pad red. S. V. Panova. – Mn. : NIA, 2022. – 176 s.
10. *Krishtal', K. N.* Istoricheskaya pamyat' kak sociokul'turnyj i pedagogicheskij fenomen / K. N. Krishtal' // Zbornik navukovyh prac Akademii adukacyi. – 2025. – Vyp. 22. – S. 146–159.
11. O Koncepcii razvitiya sistemy obrazovaniya Respubliki Belarus' do 2030 goda [Elektronnyj resurs]: postanovlenie Soveta Ministrov Respubliki Belarus', 30 noyab. 2021 g., № 683 // Nacional'nyj pravovoj Internet-portal Respubliki Belarus'. – URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100683 (data obrashcheniya: 06.02.2026).
12. Koncepciya shkol'nogo istoricheskogo obrazovaniya v Respublike Belarus'. Odobrena postanovleniem Ministerstva obrazovaniya Respubliki Belarus' 08.11.2022 № 13.2 // Gistoryya i gramadaznaŭstva. – 2024. – № 2. – S. 6–14.
13. Koncepciya optimizacii soderzhaniya, struktury i ob"ema cikla (modulya) social'no-gumanitarnyh disciplin v uchrezhdeniyah vysshego obrazovaniya / Ministerstvo obrazovaniya Respubliki Belarus'. – URL: https://www.bsuir.by/m/12_100229_1_162873.pdf (data obrashcheniya: 06.02.2026).
14. Strategiya razvitiya sistemy obrazovaniya Respubliki Belarus' do 2035 goda : Reshenie kollegii Ministerstva obrazovaniya Respubliki Belarus' ot 12 dekabrya 2024 g. № 19.33 / Etalon : informacionno-pravovoj internet-portal. – URL: https://etalonline.by/document/?regnum=u02403003 (data obrashcheniya: 06.02.2026).
15. *Lozickij, V. L.* Opyt razrabotki elektronnyh obrazovatel'nyh resursov na baze platformy Moodle dlya shkol'nogo istoricheskogo i obshchestvovedcheskogo obrazovaniya / V. L. Lozickij // Vesnik adukacyi. – 2017. – № 5. – S. 10–15.
16. *Lazicki, V. L.* Elektronny vuchebna-metadychny kompleks «Gistoryya belaruskaj dzyarzhaŭnasci» yak dydaktychny srodak navuchannya / V. L. Lazicki // Belarus. gist. chasop. – 2023. – № 1. – S. 6–9.
17. *Lozickij, V. L.* Koncept preemstvennosti urovnej obshchego srednego i vysshego obrazovaniya v usloviyah cifrovoj transformacii / V. L. Lozickij // Adukacyya i vyhavanne. – 2024. – № 11. – S. 38–43.
18. Formirovanie universal'nyh kompetencij obuchayushchihsya v kontekste vedushchih tendencij razvitiya obrazovaniya / O. V. Zelenko, V. F. Ruseckij, V. G. Stukanov [i dr.] // Vesnik adukacyi. – 2025. – № 2 (266). – S. 6–11.